*Р.Ф.ШАУРА*

## ДА ВЫТОКАЎ НАРОДНАГА МАСТАЦТВА

“Традыцыйныя рамёствы беларусаў” – так называецца навукова-творчая лабараторыя, якая функцыянуе ў БДУ культуры і мастацтваў з 2001 г.

Галоўнай мэтай дзейнасці лабараторыі з’яўляецца адраджэнне і аднаўленне на яе базе страчаных і нявывучаных тэхналогій у галіне беларускага народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Супрацоўнікамі, якія працуюць у ёй, выкананы значны навукова-даследчы і эксперыментальна-творчы аб’ём работ. Даследаваны асаблівасці развіцця традыцыйнага народнага мастацтва на розных гістарычных этапах, вывучаны маладаследаваныя і страчаныя тэхналогіі беларускага народнага мастацтва з мэтай яго аднаўлення, выкананы эксперыментальныя ўзоры па старажытных тэхніках і тэхналогіях у ганчарстве і кераміцы, двухасноўным ткацтве, шпалерным мастацтве, роспісу па-за шклом, саломапляценні.

Супрацоўнікамі лабараторыі распрацаваны новыя тэхналогіі апрацоўкі габелена пад планкі і пад кардон з выкарыстаннем дублерына, а ў ганчарстве адроджана тэхналогія дымлення і гартавання, што дало магчымасць атрымаць мастацкія рэчы ў тэхніцы рабой і чорна глянцаванай керамікі. Работа па распрацоўцы тэхналогій  працягваецца і зараз.

У дзейнасці навукова-творчай лабараторыі значная ўвага надаецца экспедыцыям, пошукам аўтэнтычных твораў народнага мастацтва. Так, у лістападзе 2003 г. калектыў лабараторыі правёў экспедыцыю ў Літву з мэтай вывучэння і даследавання матэрыялаў традыцыйнага народнага мастацтва на памежжы Літвы і Беларусі. Вельмі цікавымі аказаліся знаходкі ў архівах і музеях Каўнаса, Вільнюса. Вялася пошукавая работа ў фондах музея К.Чюрлёніса і фондах філіяла Мастацкай галерэі М.Жылінскаса ў Каўнасе, Музея літоўскай архітэктуры і быту, у архівах Інстытута гісторыі Акадэміі навук Літвы. За час экспедыцыі напрацаваны значны матэрыял па народным ткацтве, мастацкай апрацоўцы шкла і іншых прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, які на наступным этапе дзейнасці лабараторыі будзе даследаваны, сістэматызаваны і ўведзены ў навуковы ўжытак.

У канцы 2003 г., з 17 па 22 снежня, у рамках дзейнасці лабараторыі праведзена навуковая экспедыцыя ў Польшчу, якая мела на мэце далейшае вывучэнне гісторыі развіцця традыцыйнага народнага мастацтва ў памежных раёнах Беларусі і Польшчы і правядзенне навукова-творчага семінара на тэму “Традыцыйнае і сучаснае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва беларуска-літоўскага памежжа” з польскімі даследчыкамі народнага мастацтва. Удзельнікі семінара абмеркавалі шэраг пытанняў па праблемах захавання, развіцця і трансляцыі традыцыйных відаў народнага мастацтва, у прыватнасці ўзорнага ткацтва, касцюма, саломапляцення, выцінанкі і інш. Супрацоўнікі лабараторыі Л.А.Малахава, Т.І.Васюк, А.І.Непачаловіч, Л.С.Шчасная, А.І.Паз-някоў і іншыя разам з польскімі калегамі выступілі з паведамленнямі па гісторыі развіцця культуры і народнага мастацтва.

У 2004 г. работа калектыву навукова-творчай лабараторыі была скіравана на даследаванне і вывучэнне новых відаў і формаў народнага мастацтва, аднаўленне тэхналогій вырабаў у кераміцы, ткацтве, у мастацтве роспісу, на адаптацыю іх у навучальным і творчым працэсе студэнтаў. З улікам назапашанага тэарэтычнага і эксперыментальнага матэрыялу перапрацоўваюцца вучэбныя праграмы па вывучаемых дысцыплінах, рыхтуюцца вучэбна-метадычныя дапаможнікі для студэнтаў дзённай і завочнай формаў навучання. Акрамя таго, важнай справай лабараторыі з’яўляецца падрыхтоўка рукапісу калектыўнай манаграфіі ў аб’ёме 350–400 старонак. У ёй будуць змешчаны ілюстрацыі, схемы і чарцяжы, знойдуць адлюстраванне вынікі пошукаў і знаходак у развіцці беларускага народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Што тычыцца вынікаў эксперыментальна-творчай дзейнасці, то толькі за 2004 г. у лабараторыі створаны:

– 16 копій класічных шпалер (выканаўцы Н.А.Валынец і А.І.Салохіна);
– 13 узораў ткацтва (выканаўца А.І.Непачаловіч);
– 18 узораў ганчарства ў тэхніцы абварной і задымленай керамікі (выканаўца Т.І.Васюк);
– 12 узораў роспісу па-за шклом (выканаўца Л.А.Малахава);
– 78 узораў фармальнай кампазіцыі (выканаўца Л.С.Шчасная).

Супрацоўнікамі лабараторыі створаны 24 альбомы ілюстрацыйнага матэрыялу па выніках экспедыцый, рабоце ў музеях і галерэях і база даных як па матэрыялах экспедыцый у Літву і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Польшчу, так і ў цэлым па народным мастацтве на электроных носьбітах. Распрацаваны сайт у інтэрнеце аб дзейнасці навукова-творчай лабараторыі. Мяркуецца, што ён будзе працаваць ужо ў снежні бягучага года.

У кастрычніку, лістападзе мінулага года супрацоўнікі лабараторыі прымалі ўдзел у дзвюх міжнародных навуковых канферэнцыях, якія праходзілі ў Каўнасе і Маскве.

З 22 па 25 снежня 2004 г. калектыў навукова-творчай лабараторыі правёў навуковую экспедыцыю па Любанскім раёне Мінскай вобласці, а ў красавіку 2005 г. па Гродзеншчыне, у час якіх давялося наведаць шэраг вёсак, сустрэцца з цікавымі майстрамі народнай творчасці – ткачыхамі, жывапісцамі, ганчарамі, бондарамі, саломапляцельшчыкамі, рэзчыкамі па дрэве. Акрамя таго, быў вывучаны значны па аб'ёме матэрыял па ткацтве ў музейных сховішчах, прааналізаваны і зафіксаваны на фотаздымках матэрыял па ганчарстве, саломапляценні, лозапляценні, народным жывапісе. Пэўная частка унікальных экспанатаў па ганчарстве і ткацтве набыта ў майстроў, яны папоўняць фонды лабараторыі аўтэнтычнымі творамі народнага мастацтва.

Па матэрыялах навуковых даследаванняў у рамках дзейнасці лабараторыі напісаны 22 навуковыя артыкулы, 15 з іх ужо апублікаваны ў часопісах і навуковых зборніках.

Зараз асноўная ўвага супрацоўнікаў лабараторыі скіравана на далейшае даследаванне народнага мастацтва і выкарыстанне напрацаванага матэрыялу ў працэсе навучання студэнтаў па спецыялізацыях "народныя рамёствы" і "рэстаўрацыя і кансервацыя твораў ДПМ".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ